ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
__________А.В.Клімовіч
20.06 2022 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі
і правядзення абласнога
фестывалю-конкурсу
“Чароўны свет танца”

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу “Чароўны свет танца” (далей – фестываль-конкурс).

2. Фестываль-конкурс праводзіцца з мэтай развіцця, захавання і прапаганды харэаграфічнага мастацтва, вывучэння сучасных працэсаў развіцця харэаграфіі ў рэгіёне, пашырэння і ўмацавання творчых сувязей, выяўлення і падтрымкі творча адораных дзяцей і таленавітай моладзі, развіцця іх творчых здольнасцяў, павышэння ўзроўню выканальніцкага майстэрства.

3. Арганізатары фестывалю-конкурсу: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.

4. Фестываль-конкурс праводзіцца раз у два гады. У 2022 годзе фестываль-конкурс праводзіцца ў лістападзе (3-4 лістапада - першы (адборачны) этап, 26 лістапада – другі (заключны) этап). Месцам правядзення заключнага этапу фестывалю-конкурсу з’яўляецца канцэртная зала ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.

5. Інфармацыя аб правядзенні фестывалю-конкурсу размяшчаецца ў камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйных сайтах упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.

6. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем фестывалю-конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца ўпраўленнем культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Кантактныя тэлефоны аргкамітэта фестывалю-конкурсу: +375 152 55 34 39, +375 152 55 34 32.

7. Аргкамітэт:

ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем фестывалю-конкурсу;

ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення фестывалю-конкурсу і яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення фестывалю-конкурсу.

8. У фестывале-конкурсе могуць прымаць удзел навучэнцы і выпускнікі дзіцячых школ мастацтваў, сярэдніх школ, гімназій, гімназій - каледжаў мастацтваў, дзіцячыя творчыя калектывы вобласці і Рэспублікі Беларусь, замежных краін (далей, калі не вызначана іншае - удзельнікі конкурсу).

9. Фестываль-конкурс праводзіцца па намінацыях:

“народны танец”: сола, камерныя групы (дуэт, трыа, квартэт), групы ад 6 чалавек;

“сучасны танец”: сола, камерныя групы (дуэт, трыа, квартэт), групы ад 6 чалавек.

10. Для ўдзельнікаў фестывалю-конкурсу вызначаюцца тры ўзроставыя групы:

ад 7 да 9 гадоў уключна (першая група);

ад 10 да 14 гадоў уключна (другая група);

ад 15 да 18 гадоў уключна (трэцяя група).

Пры змешаным складзе ўдзельнікаў ўзроставая група вызначаецца па сярэднім узросце.

Узрост удзельнікаў фестывалю-конкурсу вызначаецца на дату яго правядзення.

11. Фестываль-конкурс для ўдзельнікаў складаецца з двух этапаў:

11.1. першы этап з'яўляецца адборачным, на якім журы ажыццяўляе прагляд відэаматэрыялаў і вызначае паўфіналістаў. Для ўдзелу ў этапе канкурсанты накіроўваюць у арганізацыйны камітэт заяўку з указаннем спасылкі на файл з відэазапісам конкурснага выступлення;

11.2. другі этап з'яўляецца заключным і праводзіцца ўпраўленнем культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і ўстановай адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.

12. Па выніках правядзення адборачнага этапу сярод удзельнікаў фестывалю-конкурсу ў кожнай намінацыі і ўзроставай групе вызначаюцца пераможцы, якія дапускаюцца да ўдзелу ў заключным этапе фестывалю-конкурсу. Інфармацыя аб паўфіналістах размяшчаецца на сайце ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.

13. Умовы ўдзелу ў фестывалі-конкурсе:

13.1. на фестываль-конкурс калектывы прадстаўляюць па адной пастаноўцы працягласцю не больш за 4 хвіліны;

13.2. тэхнічныя патрабаванні для відэазапісу: відэазапіс выступу ўдзельніка ў відэафармаце MP4, запіс кожнага выступлення павінен ўтрымліваецца ў адным файле памерам не больш за 500 МБ, быць добрай якасці, без пабочных шумоў;

13.3. музычнае суправаджэнне нумара на заключным этапе падаецца на флэш-карце (толькі з трэкамі, якія ўдзельнічаюць у конкурсным праглядзе; з указаннем назвы калектыву, твора і працягласці гучання) у дзень правядзення фестываля-конкурсу.

13.4. калектыў мае права ўдзельнічаць у некалькіх намінацыях, пры ўмове падачы заяўкі і аплаты ў кожнай намінацыі.

14. Для ўдзелу ў фестывалі-конкурсе не пазней 4 лістапада на электронную пошту art_college@mail.grodno.by накіроўваюцца наступныя матэрыялы з паметкай: "у аргкамітэт фестывалю-конкурсу "Чароўны свет танца" ў фармаце "World";

заяўка на ўдзел у фестывалі-конкурсе з указаннем спасылкі на файл з відэазапісам конкурснага выступлення па форме згодна з дадаткам да інструкцыі (дадатак 1);

спіс удзельнікаў (дадатак 2).

15. Фінансаванне выдаткаў па арганізацыі і правядзенні заключнага этапу фестываля-конкурса ажыццяўляецца за кошт сродкаў удзельнікаў, пералічаных за ўдзел у фестывалі-конкурсе ў памеры 30 руб. – сола, 40 руб. – камерныя групы (за 1 конкурсны нумар, незалежна ад колькасці ўдзельнікаў у нумары), 50 руб. – групы ад 6 чалавек (за 1 конкурсны нумар, незалежна ад колькасці ўдзельнікаў у нумары), а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Аплата за ўдзел у фестывалі-конкурсе пералічваецца на рахунак установы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў" не пазней 2-х тыдняў да пачатку заключнага этапу. Банкаўскія рэквізіты: BY74 AKBB 3632 0000 0068 0400 0000, ГОУ № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, ОКПО 02071760. (пазабюджэт), УНП 500024001.

Скан квітанцыі аб аплаце высылаецца на электронную пошту art_college@mail.grodno.by.

У выпадку няяўкі ўдзельніка на фестываль-конкурс сродкі, пералічаныя за аплату за ўдзел, не вяртаюцца.

Фінансаванне расходаў па праездзе і харчаванні ўдзельнікаў ажыццяўляецца за кошт накіроўваючага боку. Тэрміны і фармат правядзення заключнага этапу фестываля-конкурса вызначаюцца ўпраўленнем культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Матэрыялы, прадстаўленыя з парушэннем патрабаванняў сапраўднай інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

16. Для ацэнкі выступленняў удзельнікаў фестывалю-конкурсу ўпраўленнем культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта зацвярджаецца склад журы (далей - журы).

17. У склад журы заключнага этапу ўваходзяць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры Гродзенскай вобласці і Рэспублікі Беларусь, творчыя работнікі, дзеячы культуры і мастацтва.

18. Журы:

ацэньвае выкананне ўдзельнікамі фестывалю-конкурсу харэаграфічных кампазіцый;

афармляе пратаколы вынікаў выканання харэаграфічных кампазіцый;

інфармуе удзельнікаў пра вынікі іх удзелу ў фестывалі-конкурсе;

разглядае звароты ўдзельнікаў фестывалю-конкурсу па выніках ацэнкі выкананняў.

19. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі ацэнкі: узровень балетмайстарскай пастаноўкі, выканальніцкае майстэрства, якасць музычнага суправаджэння, арыгінальнасць і самабытнасць, сцэнічная культура.

20. Пераможцы фестывалю-конкурсу ўзнагароджваюцца Гран-пры з уручэннем дыплома ўладальніка Гран-пры, дыпломамі I, II і III ступені з прысваеннем звання лаўрэата фестывалю-конкурсу ў кожнай намінацыі і ўзроставай групе, дыпломамі за ўдзел, а таксама прызамі.

21. Журы ўзнагароджвае калектывы спецыяльнымі прызамі і дыпломамі: за адлюстраванне каларыту свайго рэгіёну; за арыгінальнасць і маляўнічасць сцэнічнага касцюма; за яркую індывідуальнасць выканання; за паспяховы дэбют; за музычнае афармленне нумара; за арыгінальнасць харэаграфічнай пастаноўкі; за лепшае кампазіцыйнае рашэнне нумара; за стварэнне яркага сцэнічнага вобраза; за сольнае выканальніцкае майстэрства.

22. Пры неабходнасці журы мае права дзяліць прызавыя месцы, прысуджаць не ўсе дыпломы і ўзнагароджваць калектывы спецыяльнымі дыпломамі.

23. У выпадку неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкі фестываль-конкурс праводзіцца па відэазапісах, аб чым арганізатар паведамляе ўдзельнікам дадаткова.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю-конкурсу
“Чароўны свет танца”

Заяўка
на ўдзел у абласным фестывалі-конкурсе “Чароўны свет танца”

1. Раён (горад) ______________________________
2. База дзейнасці калектыву______________________________
3. Поўная назва калектыву______________________________
4. Намінацыя______________________________
5. Узроставая катэгорыя ______________________________
6. Колькасць удзельнікаў ______________________________
7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву______________________________
______________________________
8. Кантактныя тэлефоны______________________________
9. Назва і працягласць нумару______________________________
10. Наяўнасць фанаграмы ці інструментальнай (аркестравай) групы______________________________
11. Тэхнічнае забеспячэнне (пры наяўнасці інструментальнай групы)
______________________________
12. Спасылка для прагляду конкурснага выканання ______________
______________________________
13. Творчая характарыстыка (не больш за 50 слоў) ______________
______________________________
______________________________

Кіраўнік базавай установы ______________

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю-
конкурсу “Чароўны свет
танца”

СПІС удзельнікаў

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Узрост |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

Кіраўнік базавай установы ________________